# Критика и библиография

# Крытыка і бібліяграфія

# Review and bibliography

*Белявина В. Н., Ракова Л. В.* **Белорусский костюм.** Минск: Беларусь, 2017. 463 с.: ил.
*Бялявіна В. М., Ракава Л. В.* **Беларускі касцюм.** Мінск: Беларусь, 2017. 463 с.: іл.
*Belyavina V. M., Rakava L. V.* **Belarusian costume.** Minsk: Belarus, 2017. 463 p.: il.

Адзенне з'яўляецца важным элементам культуры, які выконвае фундаментальную функцыю па забеспячэнні фізіялагічных патрэб чалавека ў ахове цела ад навакольнага асяроддзя. Акрамя гэтага, вялікае значэнне надаецца сімвалічнай ролі касцюма ў грамадстве, нездарма народная мудрасць кажа: «Сустракаюць па адзенні…». Таксама касцюм візуальна прадстаўляе знешняе аблічча і этнічныя асаблівасці народаў. У адзенні кожнага гістарычнага перыяду адлюстроўваюцца ўзровень развіцця грамадства, эканамічныя і культурныя сувязі з суседзямі, маральныя нормы, эстэтычныя густы, сацыяльны статус і маёмасны стан розных сацыяльных слаёў насельніцтва.

Культура беларусаў, развіваючыся на мясцовых этнічных традыцыях, са старажытнасці знаходзілася ў зоне пастаяннага ўзаемадзеяння з іншымі народамі рэгіёна. У выніку была створана багатая самабытная культура, якой цяпер мы можам ганарыцца.

Вывучэнне гістарычнай эвалюцыі касцюма, яго этнічных і рэгіянальных варыяцый, стыляў і фасонаў стала асобным міждысцыплінарным напрамкам, які аб'яднаў гісторыкаў мастацтва, мастацтвазнаўцаў, музеязнаўцаў, этнолагаў, мадэльераў і інш. У шэрагу выданняў па згаданай тэме этналагічныя працы займаюць важнае месца, таму што накіраваны на комплекснае і культуралісцкае, халістычнае вывучэнне святочнага і штодзённага касцюма розных гістарычных эпох, этнасаў і сацыяльных груп.

Рэцэнзуемая праца належыць пяру вядомых акадэмічных этнолагаў і з'яўляецца працягам серыі даследаванняў, прысвечаных адзенню беларусаў. Гістарычны касцюм, як феномен матэрыяльнай культуры беларусаў, вывучаны яшчэ недастаткова. Да пачатку 2000-х гг. у асноўных працах этнолагаў разглядалася толькі народнае адзенне XIX – пачатку XX ст., за межамі навуковага аналізу заставаўся вялікі пласт культуры шляхты і гараджан, а таксама складаны працэс эвалюцыі адзення.

У сувязі з гэтым фундаментальнае гісторыка-этналагічнае даследаванне В. М. Бялявінай і Л. В. Ракавай, у якім разглядаецца гістарычнае развіццё касцюма ўсіх асноўных сацыяльна-саслоўных груп гарадскога і вясковага насельніцтва Беларусі з ранняга Сярэднявечча да цяперашняга часу, з'яўляецца цікавай і практычна значнай працай.

Храналагічная працягласць разглядаемага аўтарамі гістарычнага перыяду, сацыяльна-саслоўная дыферэнцыраванасць і шматварыянтнасць касцюмных комплексаў прадстаўнікоў кожнага саслоўя патрабавалі прыцягнення да навуковага аналізу шматлікіх навуковых і літаратурных крыніц.

Аўтарамі сабраны, тэматычна сістэматызаваны, абагульнены і прааналізаваны вялікі фактычны матэрыял: летапісы і гістарычныя хронікі, археалагічныя артэфакты, інвентары, вопісы маёмасці, судовыя справы, тэстаменты з актавых матэрыялаў XVI–XVIII стст., мытныя кнігі беларускіх гарадоў, мемуарная літаратура, дзённікі і дарожныя нататкі падарожнікаў, палявыя экспедыцыйныя даследаванні аўтараў і супрацоўнікаў аддзела народазнаўства Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, працы беларускіх гісторыкаў і этнографаў XIX–XX стст.

Манаграфія багата ілюстравана мініяцюрамі летапісаў, творамі старажытнабеларускага іканапісу, старажытнымі гравюрамі, параднымі партрэтамі магнатэрыі і шляхты Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай з музейных калекцый Беларусі, Польшчы, Украіны, фотаздымкамі сярэдзіны XIX – пачатку XXI ст., што выгадна адрознівае яе ад выданняў іншых даследчыкаў. Ізаграфічныя матэрыялы добра суадносяцца з тэкстам кнігі, гэта ўзмацняе эфект ад прачытання.

Трэба адзначыць, што эвалюцыя мужчынскага і жаночага касцюмаў разглядаецца аўтарамі на фоне гістарычнага развіцця грамадства і тых палітычных, сацыяльна-эканамічных і этнічных працэсаў, якія так ці інакш уплывалі не толькі на стылі і фасоны адзення, але і на культуру Беларусі ў цэлым.

Выданне мае лагічную структуру. Кніга падзелена на дзве главы: «Мужчынскі касцюм» і «Жаночы касцюм». У кожнай главе змешчаны раздзелы па эвалюцыі касцюмных комплексаў сялян, прывілеяванага саслоўя і гараджан. Асобныя раздзелы разглядаюць у храналагічнай паслядоўнасці гістарычнае развіццё верхняй вопраткі, галаўных убораў, абутку і аксесуараў. Улічваючы важнае значэнне зброі і ваеннага касцюма для шляхты, аўтары прысвячаюць гэтай тэме таксама асобны раздзел.

У першых раздзелах абедзвюх глаў, якія прысвечаны мужчынскаму і жаночаму касцюмам прывілеяванага саслоўя і гараджан, прадстаўлены шырокі спектр гістарычных комплексаў мужчынскага і жаночага адзення – ад парадна-цырыманіяльных княжацкіх убораў XI ст. да гарадскога касцюма канца XX ст.

На шырокім фактычным матэрыяле аўтары прасочваюць працэс развіцця касцюма знаці ВКЛ у рэчышчы еўрапейскай палацавай моды, адзначаючы, што касцюм служылай шляхты ў XVI–XVIII стст. захоўваў усходневізантыйскія рысы, мелі месца і запазычанні ў часы войнаў і ўзброеных сутычак з татарамі і туркамі прадметаў іх адзення. У кнізе прадстаўлена вялікая колькасць адметных форм і крояў гістарычнага адзення, такіх як дэлія, капеняк, газука, чамара, тарлоп, жупан, кунтуш, жустакор і іншыя з усходніх шаўковых узорыстых тканін, падшытых футрам рысі, бабра, куніцы, собаля, вавёркі, лісы.

Верхнім адзеннем для верхавой язды служылі суконныя армякі, падшытыя футрам бекешы, безрукаўныя плашчы (епанчы), галаўнымі ўборамі – рознай формы шапкі, упрыгожаныя пяром чорнай чаплі, каршуна або кітой з пёраў.

У сярэдзіне XVII ст. у касцюмны комплекс шляхты ўвайшоў кунтуш, запазычаны ў венграў. Кунтуш, надзеты на жупан і падпярэзаны шырокім усходнім або слуцкім поясам, заставаўся саслоўным касцюмам этнічна неаднароднай шляхты Рэчы Паспалітай да канца XVIII ст. Такое адзенне, поруч з еўрапейскім, насілі магнаты, багатыя гараджане, служачыя гарадскіх магістратаў, пляцовыя вартавыя.

У XVIII ст. пануючым становіцца стыль ракако. Жанчыны пачынаюць насіць спадніцы на каркасе з кітовага вуса. Сукенкі гэтага перыяду мелі глыбокае дэкальтэ, тонкую, зацiснутую гарсэтам талію, вузкія рукавы да локця, упрыгожаныя знізу брыжамі з карункаў.

З 1780-х гг. у магнатаў і заможных гараджан увайшоў у моду еўрапейскі касцюм з фракам. У комплексе з ім сталі насіць камізэлькі, вузкія штаны-панталоны, бацінкі.

На мяжы XVIII–XIX стст. у жаночай модзе набыў папулярнасць грэчаскі стыль. Арыстакраткі пачалі насіць сукенкі свабоднага сілуэта з пояском пад грудзямі, але ўжо ў сярэдзіне XIX ст. вярнуліся да сукенак са спадніцай на абручах і станікам, сфарміраваным тугім гарсэтам. Жанчыны з забяспечаных слаёў гараджан у канцы XIX ст. мелі чатыры абавязковыя еўрапейскага кшталту туалеты: ранішнюю хатнюю сукенку; сукенку для шпацыраў, хаджэння па магазінах і візітаў; сукенку для хатніх прыёмаў; сукенку для тэатра, балю, званых абедаў. З пачатку XX ст. касцюм вышэйшага саслоўя і гараджан становіцца агульнаеўрапейскім.

У раздзелах, прысвечаных традыцыйнаму сялянскаму адзенню, навуковы аналіз чакана грунтуецца пераважна на багатым этнаграфічным матэрыяле XIX–XX стст. Пісьмовых сведчанняў і ізаграфічных матэрыялаў больш ранняга часу засталося мала, таму праца ў значнай ступені абапіраецца на зробленыя археолагамі рэканструкцыі касцюмаў жыхароў Беларусі X–XIII стст. Таксама аўтары зыходзілі з меркавання аб храналагічнай і рэгіянальнай устойлівасці комплексаў сялянскага адзення на працягу значнага часу.

У апісанні сялянскага касцюма перыяду Сярэднявечча даследчыцы шырока выкарыстоўвалі старажытнабеларускі іканапіс, дзе ўвядзенне ў рэлігійны сюжэт мясцовых побытавых рэалій, у тым ліку і адзення, рабіла абразы больш зразумелымі для вернікаў. З канца XIX ст. надзейнай крыніцай па гісторыі сялянскага касцюма становіцца фатаграфія, якая зафіксавала яго рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці.

Аўтары звяртаюць увагу на сціпласць і функцыянальнасць штодзённай вопраткі, а таксама на значна большае аздабленне і лепшую якасць святочнага адзення. Доўгі час вопратка была цалкам даматканай, з мясцовага лёну і воўны.

Трэція раздзелы першай і другой глаў прысвечаны разгляду гістарычных форм верхняга адзення ўсіх асноўных сацыяльных слаёў насельніцтва ад каралеўскага двара і магнатаў да сялян. Як сведчаць архіўныя крыніцы, для прывілеяваных слаёў насельніцтва верхняя вопратка шылася з дарагіх тканін (парчы, аксаміту, шоўку) яркіх колераў, падшывалася футрам і ўпрыгожвалася каштоўнымі камянямі, залатымі і пазалочанымі гузамі і гузікамі. Багацце верхняй вопраткі магнатэрыі пацвярджаецца ў кнізе партрэтнымі выявамі вялікіх князёў літоўскіх і магнатаў.

У XIX ст. мужчынскае адзенне карэнным чынам мяняецца па форме, сілуэце і асартыменце. Каляровая гама становіцца стрыманай, фрак замяняецца ў штодзённым жыцці сурдутам, а затым – пінжаком. Адзенне пачалі шыць з цёмных тканін, толькі ўлетку мужчыны апраналі белыя пінжакі і нагавіцы, а таксама прыглушанага адцення – шэрыя, крэ-

мавыя, бежавыя. Касцюм дваранска-чыноўніцкай вярхушкі гараджан вылучаўся адпаведнасцю высокай еўрапейскай модзе, каштоўнасцю тканін, бездакорнасцю аксесуараў. Адзенне мяшчан, рабочых і гарадской беднаты адрознівалася ад касцюмаў заможных гараджан якасцю тканін, адсутнасцю белых і светлых колераў.

Наступныя раздзелы ў главах прысвечаны гістарычнай эвалюцыі галаўных убораў – ад кароны да сялянскай шапкі і жаночай наміткі. Істотнае значэнне, як адзначаюць аўтары, надавалася колеру і дыхтоўнасці футра галаўнога ўбору, яго адпаведнасці еўрапейскай або мясцовай модзе. Нават жанчыны з каралеўскага акружэння, якія цалкам перайшлі на еўрапейскі палацавы касцюм, да XVII ст. не рызыкавалі хадзіць з непакрытымі валасамі. Для прыкладу аўтары згадваюць каралеву Барбару Радзівіл, якая насіла модны ў Еўропе берэт паверх чапца і жамчужнай апаяскі, якія поўнасцю хавалі валасы. Толькі ў канцы XVI – пачатку XVII ст. жанчыны з магнацкага асяроддзя пачалі насіць чапцы з залатой брамкай, якія адкрывалі валасы спераду. З сярэдзіны XVII ст. знатныя жанчыны апраналіся і рабілі прычоскі па французскай модзе часоў Людовіка XIII.

Паступова капелюшы знатных жанчын, багатых шляхцянак і гараджанак становяцца надзвычай разнастайнымі і ўсё больш пачынаюць адпавядаць элітнай еўрапейскай модзе. Іх выраблялі з аксаміту, фетру, футра, саломкі, аздаблялі карункамі, вуалямі, стужкамі, штучнымі кветкамі, пёрамі страуса.

Як важны кампанент касцюма аўтары разглядаюць абутак, найбольш старажытным відам якога на Беларусі былі плеценыя з лыка, лазовай ці вязавай кары лапці. Скураны абутак здаўна быў характэрным для гараджан. Для магнатаў і багатай шляхты абутак вырабляўся з саф'яну, які фарбавалі пераважна ў чырвоны і жоўты колеры. З пашырэннем эканамічных сувязяў з Еўропай і ростам прамысловасці павялічваўся і асартымент абутку, форма і знешні выгляд якога адпавядалі агульнаму мастацка-стылявому комплексу адзення канкрэтнага гістарычнага перыяду.

Касцюм істотна ўзбагачалі разнастайныя аксесуары: пальчаткі, фурнітура, паясы, ювелірныя вырабы. У славянскіх археалагічных помніках VI–IX стст. неаднаразова сустракаюцца бранзалеты, пацеркі, фібулы, паясныя спражкі і разнастайнай формы бляшкі ад паясных набораў.

З пачатку XVI ст. сярод магнатаў, багатай шляхты і заможных гараджан пачынаецца шырокае распаўсюджанне розных форм заходнееўрапейскага касцюма, які дапаўняўся залатымі ланцугамі, пярсцёнкамі, залатымі і сярэбранымі паясамі, каштоўнымі засцёжкамі, залатымі і пазалочанымі гузамі і гузікамі (кнафлямі) з устаўкамі з каштоўных камянёў, усходнімі шаўковымі паясамі, пра што сведчаць прыведзеныя аўтарамі шматлікія пісьмовыя крыніцы і парадныя партрэты магнатэрыі.

Аксесуары, як і ўвесь касцюм, відазмяняліся ў залежнасці ад моды. Упрыгажэнні для асноўнай масы гараджан выраблялiся мясцовымі майстрамі ў ювелірных майстэрнях у Менску, Полацку, Навагрудку і іншых гарадах Беларусі.

Адметнасць кнігі – дапаўненне аўтарамі главы пра мужчынскі касцюм раздзелам аб баявым адзенні, якое са старажытнасці займала значнае месца ў штодзённым жыцці і ваенных паходах служылай шляхты. У XII–XIII стст. асноўнай зброяй быў меч, таму ваеннае адзенне максімальна прыстасоўвалася да абароны цела воіна ў блізкім баі.

Вынаходніцтва пораху дало пачатак вырабу агнястрэльнай зброі, якая зрабіла пераварот у ваеннай справе. Аўтарамі разглядаюцца змены ў стратэгіі і тактыцы ваенных дзеянняў, эвалюцыя зброі шляхты ў XIV–XVIII стст., адзначаецца ўплыў заходнееўрапейскай рыцарскай культуры на ваенную арганізацыю княства. Ваенны рыштунак павінны былі мець і члены гарадскіх рамесных цэхаў на выпадак ваенных дзеянняў ці аблогі горада непрыяцелем. З XVI ст. неад'емным элементам касцюма шляхціца стала шабля, як сімвал яго прыналежнасці да адпаведнага саслоўя.

Аднак трэба звярнуць увагу і на некалькі момантаў, якія аўтары, на мой погляд, не здолелі асвятліць належным чынам. Нягледзячы на цалкам правільнае імкненне даць цэласную карціну па разглядаемым пытанні, у працы крыху выпадае позняе Сярэднявечча. Таксама часта змены ў модзе і адзенні апісваюцца як лагічныя падзеі (перадусім з XXI ст.), але прычыны гэтай з'явы абгрунтаваны не заўсёды.

Вялікі і цікавы матэрыял, змешчаны ў кнізе, навуковасць і дакладнасць фармулёвак і гарманічнае спалучэнне ў тэксце этналагічнага, гістарычнага і мастацтвазнаўчага аспектаў, распрацаваны аўтарамі паняційна-тэрміналагічны апарат робяць разгледжаную кнігу карыснай для даследчыкаў матэрыяльнай культуры беларусаў, мастакоў, дызайнераў касцюма і масавага чытача.

*С. А. Захаркевіч*[1]

[1]*Степан Артурович Захаркевич* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Сцяпан Артуравіч Захаркевіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Stsyapan A. Zakharkevich*, PhD (history), docent; associate professor at the department of ethnology, museology and history arts, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *stepanzah@mail.ru*